

А ГАРМОНІК ГРАЕ, ГРАЕ...

У ДАПАМОГУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Бясплатны дадатак да часопіса
«Маладосць» № 10 (104) 1961 г.

Цэзар САЛАДАР

СЛЕД НА ЗЯМЛІ

Рамантычная камедыя ў адной дзеі

Музыка Д. Кабалеўскага

Дзеючыя асобы:

Сіўкоў Хведар Іванавіч — брыгадзір экскаватарнай брыгады на сібірскай будоўлі, гадоў болей за 40.
Людміла Пятроўна — яго жонка, прыгожая жанчына, выглядае маладзей за свае 36 гадоў.
Іра Троіцкая — з экіпажа Сіўкова, 19 год.
Шацько Трахім Трахімавіч — крыху старэйшы за Сіўкова.
Алег — выпускнік тэхнікума, 21 год.
Бубкіна Мая Гур'еўна — супрацоўніца жыллёва-камунальнай канторы, год 34.

Дзея адбываецца ў нашы дні на сібірскай новабудоўлі.
Перад пачаткам спектакля гучыць песня будаўнікоў:

Всю отчизну, друзья, обойдите
От Памира до северных рек —
Везде и повсюду рабочий-строитель
Почётный у нас человек.
Во славу народа-героя,
Во имя великих идей
Мы строим, мы строим, мы строим
Для блага советских людей!

Падымаецца заслона. Прасторны пакой у аднапавярховым доміку ў пасёлку будаўнікоў на Енісеі.

Летні адвячорак. Нягледзячы на часовае абсталяванне — складны стол, канапку, што замяняе ложак, — пакой выглядае ўтульным. На відавоку — кніжная шафа, вялікі радыёпрыёмнік і гітара, якая вісіць над вялізным фотаздымкам-панарамай гідраэлектрастанцыі. Фотаздымкаў на сценах вельмі многа.

Двое дзвярэй: адны — уваходныя, другія — на кухню. Ля акна, узіраючыся ў далячынь, стаіць Людміла Пятроўна, яна кагосьці чакае. Чуваць песня будаўнікоў.

И преграды мы все покоряем
Замечательной силой труда,
Заводы в горах и лесах воздвигаем,
В тайге создаем города.
Во славу народа-героя,
Во имя великих идей
Мы строим, мы строим, мы строим
Для блага советских людей!

За акном чуецца звонкі голас Іры Троіцкай: «Ой, Людміла Пятроўна! Каб вы ведалі, хто прыехаў!»

Людміла Пятроўна (*здзіўлена*). І нават дадому не забег?

Іра (*лезе ў акно*). Не, не Хведар Іванавіч! Карэспандэнт! З Масквы!

Людміла Пятроўна. Падумаеш, вось радасць...

Іра. Ён узяў у мяне інтэрв'ю.

Людміла Пятроўна. Пра што ж ён гутарыў з табою?

Іра. Не гутарыў, а ін-тэр-в'ю-іраваў. Яго юбілейнае інтэрв'ю. Двухсотае. У Мікалая Мамая браў, у прынца з Камбоджы, у італьянскай кінаактрысы Сільваны Пампаніні.

Людміла Пятроўна. І ў памочніка механіка чырванасцяжнага экскаватара «Уралец» Ірыны Троіцкай?

Іра. Не смейцеся. Ён хацеў у самога Хведара Іванавіча. Ужо восьмы год ганяецца за ім. Яшчэ ад Кахоўкі. Толькі, кажа, прыеду на ўрачыстасць, а мяне — бац па галаве!— Хведар Іванавіч Сіўкоў ужо на другой будоўлі!

Людміла Пятроўна. З Кахоўкі Федзя ў Грузію паехаў. У гарах катлаван капаў. А адтуль — на Волгу.

Іра. Карэспандэнт ведае ўсе маршруты Хведара Іванавіча. Цікавіўся, ці не паехаў Хведар Іванавіч і адсюль.

Людміла Пятроўна. Але ты сказала, што толькі ў адпачынак?

Іра. Сказала. Карэспандэнт спачатку не паверыў: як жа так — у самы адказны момант, перад тым, як пускаць аб'ект, лепшы экскаватаршчык едзе ў адпачынак!

Людміла Пятроўна. Дык ты сказала...

Іра. Сказала, што брыгада Сіўкова выканала свой план датэрмінова. Потым, кажу, мы памаглі дзвюм адстаючым. Хведар Іванавіч так стаміўся, што начальства прымусіла яго...

Людміла Пятроўна. Ну, між намі, адно начальства не прымусіла б Федзю паехаць у адпачынак! *(Усміхаецца.)* Але для інтэрв'ю гэта не мае значэння.

Іра. Карэспандэнт спытаў: «На якім курорце адпачывае Хведар Іванавіч? Я дам тэлеграму, у яго возьмуць інтэрв'ю».

Людміла Пятроўна. Ну, а ты...

Іра *(з захапленнем)*. Ну, а я сказала, што вось ужо пятнаццаты год Хведар Іванавіч ездзіць у адпачынак толькі да сябе на радзіму — у Шчыгры! Што кожны год ён прывозіць адтуль папаўненне ў свой экіпаж... І што летась з ім са Шчыгроў прыехала я.

Людміла Пятроўна *(з хітрынкай)*. І што другі год сумуеш тут па Шчыграх і па... аднаму тамтэйшаму жыхару.

Іра *(загарэлася)*. Калі вы, Людміла Пятроўна, намякаеце на Алега, дык у парадку выхавання сілы волі я дала сабе слова зусім пра яго не думаць.

Людміла Пятроўна. Зусім?

Іра. Ну... У рабочы час.

Людміла Пятроўна. І трымаеш слова?

Іра *(збянтэжана)*. Так і лезе ў галаву... Як на злосць!

Людміла Пятроўна. Чаму на злосць? *(Абдымае Іру.)* На дабро. Я чула, ён цябе кахае...

Іра. Камісія на каханне не глядзіць!

Людміла Пятроўна. Якая камісія?

Іра. Тая, што размяркоўвае выпускнікоў тэхнікума. Алег піша, што ўвесь іх выпуск накіроўваюць на Далёкі Усход. *(Уздыхнула.)* А я... *(Журботна прыхінулася да пляча Людмілы Пятроўны.)*

Людміла Пятроўна. Нічога, нічога. У нас, Ірынка, з каханнем лічацца. Нават такі суровы брыгадзір, як Хведар Іванавіч.

Іра *(адхінулася ад Людмілы Пятроўны)*. Вы хочаце, каб Хведар Іванавіч адпусціў мяне?

Людміла Пятроўна. Чаму я? Мусіць, ты захочаш... Калі... папраўдзе не можаш без Алега.

Іра *(глядзіць у акно)*. Да вас нехта.

Людміла Пятроўна. Можа карэспандэнт? *(Заклапочаным позіркам аглядае, ці добра прыбрана ў пакоях, папраўляе абрус, ставіць на месца вазу з кветкамі.)*

Іра *(зірнуўшы ў акно)*. Не, не ён.

Людміла Пятроўна *(нездаволена)*. Ой, мне яшчэ да Федзевага прыезду пельмені зварыць трэба.

Іра. Незнаёмы нейкі.

Людміла Пятроўна. Ты пагавары з ім, а я цеста пагляджу. *(Ідзе на кухню.)*

Стук у дзверы.

Іра. Калі ласка. *(Ідзе да дзвярэй.)*

На парозе з'яўляецца Шацько, у парусінавым касцюме і шыракаполым саламяным капелюшы, які нагадвае ўкраінскі «брыль». Унутраная сіла адчуваецца ў гэтым чалавеку, якому, на першы погляд, не дасі пяцідзесяці гадоў. Гаворыць з лёгкім украінскім акцэнтам.

Шацько *(мусіць чакаў убачыць не Іру)*. Дзень добры, мне Сіўкова, Хведара Іванавіча.

Іра. У адпачынку. *(Убачыўшы засмучэнне на Шацьковым твары, спяшаецца дадаць.)* Чакаем з хвіліны на хвіліну.

Шацько. А жонка? Людміла Пятроўна?

З кухні выходзіць Людміла Пятроўна.

(Усміхаючыся, глядзіць на яе.) Дзень добры, сардэнька Людмілачка.

Людміла Пятроўна *(заўсміхалася)*. Трахім Трахімавіч! Добры дзень, дарагі!

Шацько. Пазналі, сардэнька Людмілачка? Значыць, не так пастарэў ужо дзядзька Трахым.

Людміла Пятроўна. Ды я вас і праз сто год пазнала б.

Шацько. Ну, добры дзень, Людміла Пятроўна.

Ціснуць адно аднаму рукі.

Людміла Пятроўна. Як вы хочаце, а я вас пацалую.

Шацько. Гэта можна: да мяне Хведар Іванавіч раўнаваць не будзе.

Цалуюцца.

Ды яшчэ пры сведцы.

Людміла Пятроўна. Знаёмцеся са сведкай. Іра Троіцкая. З Федзевага экіпажа.

Шацько *(паціскаючы Іры руку)*. Шацько. Хутка дзядулем буду. А некалі мы ў Каховцы з Людмілачкай дуэты на вечарах спявалы. Пад гром апладысментаў. *(Заспяваў.)* «Ой, закувала та сыва зозуля...» *(Людміле Пятроўне.)* А тую, Федзеву любімую, спяваеце?

И в морозы, и в зной, и в ненастье
Не уйдём с трудового поста...

Людміла Пятроўна *(падпявае):*

На стройках страны добывается счастье,
Сбывается наша мечта.

Іра *(разам з імі падхоплівае прыпеў):*

Во славу народа-героя,
Во имя великих идей
Мы строим, мы строим, мы строим
Для блага советских людей.

Шацько *(Іры).* Бачу, і вам наша «Будаўнічая» спадабалася.

Іра. Увесь экіпаж спявае.

Шацько. Я з Каховкі яе на Куйбышаўскую ГЭС прывёз — і там таксама хлопцы яе заспівалы.

Людміла Пятроўна. А Федзя ў Грузію яе завёз. *(Паказвае здымак на сцяне.)* Бачыце, Шота Санадзе. Брыгадзір. З Федзем спаборнічаў. Гэтак яму ваша песня да душы прыйшлася, што ўмову паставіў: у каго пераходны чырвоны сцяг, тыя і выходзяць з ёй на дэманстрацыю.

Іра *(да Шацько).* Нам Хведар Іванавіч расказваў, як у Каховцы склалі гэтую песню.

Шацько. Але, дзяўчынанька, такая атрымалася сітуацыя, што без песні, ну, як без цэменту! І мусілі мы з Федзем паэтамі стаць. Потым камсамольцы памаглі, адшліфавалі, дапісалі.

Іра *(узрадавана).* Дык гэта вы той вядомы прараб, якога... *(Змоўкла, злавіўшы хітраваты позірк Людмілы Пятроўны.)*

Шацько *(смяецца).* Кажыце, дзяўчынанька, кажыце, не пакрыўджуся. Якога звалі «скажэнны»?

Іра. А што? «Скажэнны» — вельмі... гучнае слова!

Шацько. Толькі ў перакладзе з украінскай гэтае гучнае слова азначае «шалёны».

Людміла Пятроўна *(падаючы на стол).* А мы яго перакладзём, як людзі разумелі: смелы, удалы, вясёлы!

Іра. І я так разумею. *(Да Шацько.)* А ў вас у Каховцы шавялюра хоць куды была! *(Паказвае яму здымак на сцяне.)*

Шацько *(смяецца).* А вы праз дванаццаць год таксама... старэй выглядаць будзеце.

Іра. Вядома. *(Смяецца.)* Але не ўяўляю сябе такою.

Людміла Пятроўна *(да Шацько).* У апошні раз вы Федзю, здаецца, з Казахстана пісалі?

Шацько. Але. З Бухтармінскай ГЭС.

Іра. А цяпер вас сюды перакінулі?

Шацько. Не. Я да вас... нібы за дэлегата. На пуск электрастанцыі. Хачу даведацца, як гэта вы змаглі датэрмінова яе пабудаваць.

Іра. Колькі ж вы з Бухтармы да нас дабіраліся?

Шацько. Я ўжо не бухтармінскі, а далёкаўсходні. Правільней, амурскі.

Іра *(уздыхнуўшы).* Добрыя мясціны на Амуры? Прыгожыя?

Шацько. Прыгожыя — не тое слова. Казачныя. Лепшых мясцін, як на Амуры, нідзе няма, далібог!

Людміла Пятроўна. Вы некалі тое ж самае, ну проста слова ў слова, казалі пра Дняпро.

Шацько. Няўжо? Вось памяць у вас!

Іра. Вы даўно ўжо там?

Шацько. На Амуры? *(Закашляўся.)* Папраўдзе кажучы, толькі еду туды. Выклікалі ў Маскву — і прызначылі.

Людміла Пятроўна. «Прызначылі». Сілком не прызначаюць. Ох, не сядзіцца вам! Дзядулем хутка станеце, час бы сваё гняздо звіць.

Шацько. Вы гэта Федзю парайце.

Людміла Пятроўна. Няма чаго яму раіць. Сам ужо з начальствам дамовіўся: застаецца тут.

Шацько *(здзіўлена).* Тут? *(Спакайней.)* А што ж цяпер тут такому экскаватаршчыку рабіць?

Людміла Пятроўна. Федзя будзе інструктарам па будмеханізмах.

Шацько *(пасля кароткага роздуму).* Што ж, усё правільна.

Людміла Пятроўна *(уважліва паглядзела на яго).* Вядома, правільна. Гады ідуць. Вернуцца дзеці з піянерскага лагера — большага будзем у школу запісваць.

Шацько. Правільна. І меншаму, мабыць, не багата да школы асталося.

Людміла Пятроўна. Праз год і меншы ў школу пойдзе.

Шацько. Ну, тады вядома...

Іра. Хведару Іванавічу кватэру даюць. Бачылі пры ўездзе новыя дамы?

Людміла Пятроўна. Збіралася заўтра па мэблю

ў Краснаярск, ды не выходзіць, паедзем з Федзем дзяцей праведаць. А паслязаўтра ўжо абавязкова паеду па мэблю.

Шацько. Вядома, аселаму чалавеку без мэблі ні сюды і ні туды. *(Паказвае на фотаздымак.)* Ведаеце, Шота Санадзе ўжо да нас на Амур паехаў.

Людміла Пятроўна. Няўжо? А бажыўся ж, што толькі на поўдні будаваць будзе. Душа, казаў, поўначы не прымае.

Шацько. Яму міністр пісьмо прыслаў.

Іра. Асабіста яму?

Шацько. І яшчэ некалькім вядомым экскаватаршчыкам. Просіць памагчы далёкаўсходняй будоўлі.

Іра. Сам міністр? Здорава. Праўда, Людміла Пятроўна?

Людміла Пятроўна *(да Шацько)*. Колькі ж такіх пісьмаў міністр паслаў?

Шацько. Шэсць. Не, сем... А што?

Людміла Пятроўна. Нічога. Ой, пра вячэру забылася! Трахім Трахімавіч, пацярпіце паўгадзінкі?

Шацько. Каб паесці вашых варэнікаў і каўбасы, магу і дзве гадзіны цярпець.

Людміла Пятроўна *(смяецца)*. Не, сёння вам давядзецца маіх пельменяў пакаштаваць і беляшоў.

Шацько. Зразумела — сібірскае меню.

Людміла Пятроўна *(у дзвярах)*. Сёння — сібірскае. А заўтра грузінскім абедам накармлю — харчо, люля-кебаб, хачапуры! *(Ідзе на кухню.)*

Іра. Лепей за ўсё Людміла Пятроўна варыць юшку паволжску.

Шацько. Зразумела: Хведар Іванавіч жа Камсамольск-на-Волзе будаваў. А меню Людмілы Пятроўны ўвесь яго шлях, так сказаць, адлюстроўвае... Геаграфію нашага брата, бадзяг-будаўнікоў, яшчэ і па песнях вызначыць можна. Вось я... У Кахоўцы «Рэве та стогне» спяваў. Пад Куйбышавам «Горы Жыгулёўскія» спадабаліся. *(Адышоў да акна.)*

Іра *(падышла да яго, прысела на падаконнік)*. А на Далёкім Усходзе што спяваюць? «По долинам и по взгорьям»?

Шацько. Далёкі Усход — вялікі. І песень там шмат.

Іра ўздыхнула.

Вы чаго, дзяўчынанька, уздыхаеце?

Іра. Гэта вам здалося. *(Уздыхнула яшчэ сумней.)*

Шацько. Не, бачу, што гаворка пра Далёкі Усход на вас сум наводзіць.

Іра адвярнулася.

Чаго б гэта? *(Хоча паглядзець у Ірыны вочы.)*

Хаваючыся ад яго позірку, яна высунула галаву ў акно. Абое не чуюць стуку ў дзверы.

Чаго б гэта?

Іра. Разумееце, Трахім Трахімавіч, туды атрымлівае прызначэнне... адзін чалавек.

Шацько. Не разумею. Чаму ж туды не можа паехаць другі чалавек?

Іра *(умомант азірнулася)*. Кінуць наш экіпаж? І Хведара Іванавіча? *(Не знаходзіць слоў.)* Гэта ж... мая сям'я! Не, Трахім Трахімавіч, я не магу адсюль паехаць. *(Захопленая гутаркаю, не заўважае, як увайшоў малады хлопец з чамаданамі ў абедзвюх руках — вялікім і маленькім.)* Я так проста і скажу яму: Алег, я з табою не паеду!

Алег *(выпусціў чамадан)*. Чаму, Іра?

Іра *(кідаецца да яго)*. Алежак!

Алег. Іра... *(Зноў бярэ чамадан.)*

Іра абдымае і цалуе яго. Ён, не выпускаючы з рук чамадана, нясмела адказвае на яе пацалунак.

Іра *(адхінуўшыся ад яго)*. Што ты робіш? Як табе не сорамна?

Алег. Але я... але ты сама...

Іра. Ты хочаш сказаць, што я сама кінулася табе на шыю?

Алег. Я... Я...

Шацько. Я хачу сказаць, што гэта зусім не так... Пазнаёмілі б нас.

Іра. Прабачце, Трахім Трахімавіч... Гэта Алег Гур'янаў. Наш, шчыгроўскі. Закончыў дарожны тэхнікум.

Шацько. З дарожнікамі будаўнікі сябруюць. Кажуць, перад тым, як стварыць свет, бог праклаў да яго дарогу. *(Працягвае руку Алегу.)* Шацько.

Алег *(паставіўшы на падлогу вялікі чамадан, цісне Шацько руку)*. Алег. *(Адразу ж зноў бярэ чамадан.)*

Іра. Ды пастаў ты, нарэшце, чамаданы!

Алег. Гэта не мой. Хведара Іванавіча. З падарункамі.

Уваходзіць Людміла Пятроўна.

Людміла Пятроўна. Алег? З падарункамі.

Іра. Як вы яго пазналі?

Людміла Пятроўна. Ты мне яго здымак, няйначай, разоў сто паказвала! *(Убачыўшы мужаў чамадан.)* Хведар Іванавіч, вядома, спачатку пабег на будоўлю?

Ш а ц ь к о *(з хітрыкай)*. Што вы хочаце ад аселага чалавека?

А л е г. Сказаў, усяго на хвіліначку.

І р а *(Алегу)*. Як ты тут апынуўся?

Л ю д м і л а П я т р о ў н а *(апярэдзіла яго)*. Не здагадваешся? Алегу далі прызначэнне ў Сібір, і Хведар Іванавіч забраў яго сюды. *(Да Алега.)* Праўда?

А л е г. Не, я тут... па дарозе.

І р а *(загарэлася)*. Едзеш на Далёкі Усход?

А л е г. Увесь выпуск наш едзе. Мы атрымалі пісьмо з Амура. І вынеслі рэзалюцыю. Я таксама галасаваў.

І р а. Ты прыехаў... развітацца са мною?

А л е г. Я прыехаў... забраць цябе з сабою.

І р а *(задзёрыста)*. Забраць?

Паўза.

Ш а ц ь к о *(стараючыся ўсё звесці на жарт, паказвае ў акно)*. Няўжо, Людміла Пятроўна, у вас тут кавун расце?

Л ю д м і л а П я т р о ў н а. Што?.. Ой, забылася, вы ж кавуны любіце. Расці расце, а вось ці вырасце? Федзя ў гаршчочках прарасціў ды на градку перасадзіў. Кажа, Кахоўку напамінае.

Ш а ц ь к о *(з робленай цікавасцю)*. Трэба паглядзець! Падумайце, кавун на Енісеі!

З выглядам, што ім зусім няма справы да Іры і Алега, Ш а ц ь к о і Л ю д м і л а П я т р о ў н а выходзяць.

А л е г. Іра, не злуйся. *(Хоча ўзяць яе за руку.)*

І р а *(забірае руку)*. Прыехаў, значыцца, па мяне?

А л е г. Ну, не па цябе, а... запрасіць... паехаць з намі... са мною.

І р а. Я не вашага выпуску і за рэзалюцыю не галасавала.

А л е г. Іра! Далёкі Усход! Так ганарова... Нам, ведаеш, як адтуль пісалі? «Чакаем вас на фарпосце сямігодкі».

І р а. А тут, на Енісеі, па-твойму, глыбокі тыл?

А л е г. Вядома, не тыл! Але ўсё ж тут ты...

І р а. Пятая спіца ў калясніцы? Так?.. Ды ты ведаеш, што значыць экіпаж Хведара Сіўкова? Ты разумееш, хто такія сіўкоўцы? Хочаш, каб я пакінула наш экіпаж?

А л е г *(пасля паўзы, гледзячы ўбок)*. Я думаў, ты... мяне кахаеш...

І р а. Я тое ж думала пра цябе.

А л е г *(горача)*. Іра! Ірачка!.. Я цябе... Ты мне... *(З прыкрасцю.)* Але што казаць! Сама ведаеш! Ведаеш, як я хачу быць разам з табою...

І р а *(падыходзіць да яго, кудлаціць валасы)*. Вядома, ведаю, Алежак... Але што ж нам рабіць? Як жа я пакіну экіпаж? Тут жа будуюць новы горад. Ён хутка ўжо будзе на карце. Сэрца вялікага краю!

А л е г. Во-во, як сэрца. Нам на першай жа лекцыі сказалі: дарогі — як артэрыі для сэрца.

І р а *(нецярплівa)*. Лепей бы вам прачыталі лекцыю пра дзявочае сэрца — ты, можа, быў бы больш... чулы.

А л е г. А дзе ж твая чуласць?

І р а *(загарэлася)*. Што?! Па-твойму, я...

А л е г. Ірачка! Ты не зразумела... Іра...

І р а. Не злуй мяне, бо пасварымся — і... Слухай! Тут, на Енісеі, дарожнікам работы па горла! Што, калі Хведар Іванавіч ад імя... Словам, напіша хлопцам вашым: адпусціце Алега да нас, у нас да новага горада пракладваецца траса.

А л е г *(нясмела)*. На Амуры таксама пракладваюць!

І р а. Але тут траса плюс... *(Адвярнулася.)*

А л е г. Плюс ты!.. Ты праўду кажаш, Іра. *(Хоча яе абняць.)*

У гэты момант уваходзяць Л ю д м і л а П я т р о ў н а, Ш а ц ь к о і С і ў к о ў, ён паклаў руку на жончыны плечы.

С і ў к о ў. Добры дзень, Ірынка.

І р а. Добры дзень, Хведар Іванавіч. *(Афіцыйным тонам.)* Магу далажыць вам, што...

С і ў к о ў. Ведаю, ведаю. Без мяне ў гразь тварам не ўпалі *(Дае ёй пісьмо.)* Ад маці. Пасылачка — у чамадане.

І р а. Дзякую. *(Разрывае канверт, чытае.)*

С і ў к о ў. Ты, Ірынка, раніцаю пакажы Алегу будоўлю. Ён жа толькі на два дзянёчкі да нас.

А л е г. Не, Хведар Іванавіч, можа быць, я яшчэ... Словам, хачу з вамі параіцца... Вельмі важная ў мяне справа.

Л ю д м і л а П я т р о ў н а. Пра справы потым! Цяпер вячэраць пара... Іра, падавай на той стол, што ў садзіку.

І р а. Правільна! *(Кладзе пісьмо ў канверт, збірае посуд са стала.)* Алег, памагай.

А л е г. Ёсць памагаць! *(Збірае посуд.)*

Л ю д м і л а П я т р о ў н а. А хто па віно пойдзе?

І р а. Алег пойдзе.

А л е г. Пайду.

Л ю д м і л а П я т р о ў н а. Што ты? Госць!

А л е г. Толькі... я не ведаю — куды.

Іра. Знойдзеш.

Алег. Знайду.

Людміла Пятроўна *(усміхаецца)*. Што ж, ідзіце. *(Ідзе на кухню.)*

Іра *(да Алега)*: Толькі ты — адна нага тут, другая там... Вобмельгам!

Алег. Вобмельгам.

Выходзяць.

Шацько *(правёўшы Алега ўсмешкаю)*. Ведае хлопец дысцыпліну.

Сіўкоў. Ого, брат, наша Ірынка — начальніца суровая... Сядай, Трахім Трахімавіч, пагаманім, пакуль вячэраць не клічуць.

Шацько. Ну, аселы чалавек, як жывеш?

Сіўкоў. Ты чаму мяне аселым завеш?

Шацько. Тут жа якар кідаеш.

Сіўкоў. Здзівіўся?

Шацько. Не вельмі. Старыя людзі кажуць: самы неўтаймаваны работнік хоць калі-небудзь павінен жа ўтаймавацца

Сіўкоў. Ты вось ніяк не ўтаймуешся.

Шацько. Не атрымліваецца, Федзя.

Сіўкоў. Што ты там, на Амуры, будаваць збіраешся?

Шацько. У двух словах не раскажаш. Спачатку электрастанцыю паставім. Да яе мясцовы газ падвядуць. Побач каляровая металургія будзе. Потым абутковы камбінат. Ну, лесанарыхтоўшчыкам і рыбакам таксама тое-сёе пабудаваць трэба. Словам, усё нас там чакае: і недры, і кедры, і сардзіны, і турбіны. Які багаты край, Федзя! Як сеў я ў Маскве ў цягнік, дык усё і думаю: які ён, Далёкі Усход? Еду, еду... Заволжа, Урал, Заўралле. А я гляджу ў акно і... Памятаеш, як у Твардоўскага...

...А там своя, иная даль.
А там Байкал, за тою далью,
В полсуток обогнуть едва ль, —
А за Байкалом —
Забайкалье,
А там еще другая даль,
Что обернётся далью новой,
А та, неведомая мне,
Ещё с иной, большой, суровой,
Сомкнётся и пройдёт в окне...
А той порой, отменно точный,
Всего пути исполнив срок,
Придёт состав дальневосточный
На Дальний, собственно, Восток...

Сіўкоў. Бачыш ты, вершамі гаворыш.

Шацько. Ты вершы любіў.

Сіўкоў. І цяпер люблю. У мяне ў кабіне плакат вісіць — вершы з нашай песні, памятаеш? *(Напявае)*:

Мы верны нашей партии свято,
Мы родному народу верны.
И то, что Ильич наш предвидел когда-то,
Сегодня построить должны...

Шацько *(задуменна)*. Павінны, Федзя, павінны.

Сіўкоў. Ну, а да нас чаго заехаў? *(Дапытліва глядзіць на Шацько.)* Крук нічога сабе.

Шацько. Зноў будзь здароў — чаго! Я ж табе казаў — хачу вопыту ў вас павучыцца.

Сіўкоў *(між іншым)*. Па вопыт, выходзіць, падаўся.

Шацько. Будоўлі нашы вельмі падобныя.

Сіўкоў. Вельмі. У нас гідрастанцыя, у вас цеплавая. У нас — скальны грунт, а ў вас — тайга. Наша будоўля на вашу падобна, як мой дзед на тваю бабку.

Шацько. Прычым тут мая бабулька?

Сіўкоў. Прытым, што не хітруй, Трахімавіч. Ні па які вопыт ты сюды не прыехаў.

Шацько. Ну, няхай не толькі па вопыт. Цябе пабачыць. Што ж, хіба нельга даўняга сябра праведаць?

Сіўкоў. Можна. Толькі не праведаць мяне ты хочаш.

Шацько. А што ж? Пасватаць? Дык ты ж ужо шаснаццаць год пасватаны.

Сіўкоў. Пасватаць. На Далёкі, уласна, Усход, на вашу будоўлю завабіць.

Шацько. «Завабіць». Хіба ж ты дзяўчына, каб цябе заваблівапь?

Сіўкоў. Яны да цябе, Трахімавіч, сотнямі едуць. Я газеты, дзякуй богу, чытаю. А табе, брат, трэба некалькі бывалых будаўнікоў. Каб дзяўчат гэтых падвучыць. Правафланговыя табе трэба.

Шацько *(шчыра)*. Трэба, яшчэ як, Федзя, трэба. *(Уздыхнуў.)* Толькі на цябе ў мяне прыцэлу быць не можа.

Сіўкоў. Пастарэў?

Шацько. Не ў гэтым справа.

Сіўкоў. А ў чым?

Шацько. Кавуны разводзіш?

Сіўкоў. Ты, Трахім Трахімавіч, мне кавунамі вочы не калі. Я ў Грузіі фруктовы сад пасадзіў. І пакінуў, калі паехаў

на Куйбышаўскую. Людзі дагледзяць. Няхай і тут не толькі на будоўлі, але і на градзе астанецца мой след на зямлі.

Шацько. «След на зямлі!» Нямала ты іх пакінуў. Лёгка сказаць, чвэрць века будуеш.

Сіўкоў. Не, толькі дваццаць два гады. Тры гады разбураў.

Шацько. То ж на вайне.

З кухні выходзіць Людміла Пятроўна і, стараючыся ім не перашкаджаць, дастае прадукты з шафы.

Сіўкоў. У трыццаць чацвёртым прыплёўся я на Урал грабаром з рыдлёўкаю ды самаробным куфэрачкам за спіною — і на амерыканскі «марыён», як на нешта казачнае, рот разявіў!

Шацько. Але, той малюсенькі паравы экскаватар нам у той час цудам-машынай здаваўся.

Людміла Пятроўна (*жартаўліва*). Вечар успамінаў.

Шацько. Кепска, па-мойму, чалавеку, калі няма ў яго пра што ўспамінаць, каб на сэрцы пацяплела.

Людміла Пятроўна. І па-мойму, кепска.

Сіўкоў. «Марыён», «марыён». Думаю, няўжо мне сівалапаму, калі-небудзь такую махіну даверацъ.

Шацько. А Ірына, мабыць, адразу на шагаючы села?

Сіўкоў. На чатырохкубавы «ўралец».

Шацько. Цяпер у вас і «ўральцам» рабіць няма чаго. Усе зямляныя работы быццам бы скончаны?

Сіўкоў. Скончаны.

Шацько. А ў нас толькі пачнуцца.

Сіўкоў. У вас пачнуцца.

Людміла Пятроўна. Федзя, можа і ты са мной у Красноярск паслязаўтра паедзеш?

Сіўкоў. Чаго?

Шацько. Па мэблю.

Сіўкоў. А-а, паедзем, Людачка, у мяне яшчэ чатыры дні адпускных.

Людміла Пятроўна ідзе на кухню.

А багата вам у тайзе карчаваць давядзецца?

Шацько. Пакуль шэсцьдзесят квадратных кіламетраў. Слухай, вазьміце мяне заўтра з сабою...

Сіўкоў. Куды?

Шацько. Да дзяцей, у лагер. Хачу паглядзець на іх — калі яшчэ нам сустрэцца давядзецца.

Сіўкоў маўчыць.

Добрая яна ў цябе, Людміла...

Сіўкоў. Добрая.

Шацько. Жонцы будаўніка часам нясоладка. Тут трэба, як на фронце казалі, баявая сяброўка.

Сіўкоў. Люда такая і ёсць... А якую ж тэхніку вам туды падкінуць?

Шацько. Ну, калі па тваёй частцы, то спачатку вопытную партыю новых «уральцаў». У іх новая канструкцыя ходу.

Сіўкоў. Бачыў. У Маскве, на будаўнічай выстаўцы.

Шацько. Флагман сярод экскаватараў! Такую махіну не ўсякаму давeрыш. Нам жа не толькі яе асвоіць трэба. Яшчэ і падказаць заводу, дзе што палепшыць, калі ў серыйную вытворчасць пусцяць.

Сіўкоў. Мне б даверылі?

Шацько. Нашто жартаваць? (*Сумна.*) Ты, Федзя, выбыў з гульні. (*Адышоў да акна.*)

Сіўкоў (*горача*). Крыўдуеш? (*Падыходзіць да яго*). Я ведаю, што ты думаў! Ты думаў, як раскажаш мне пра амурскую будоўлю, я ад радасці пад столь падскочу: еду, Трахім Трахімавіч! Сам еду і ўвесь экіпаж за сабой пацягну. Так ты думаў?

Шацько (*пасля паўзы*). У цягніку так, а тут...

На парозе з'яўляецца Людміла Пятроўна, але, захопленыя гаворкай, Сіўкоў і Шацько яе не заўважаюць.

Сіўкоў. Зразумей, Трахім, Люда стамілася сюды-туды ездзіць. Яна хоча, як усе людзі...

Людміла Пятроўна (*нечакана*). Што, ты кажаш, я хачу?

Сіўкоў і Шацько азірнуліся.

Шацько. Што ён можа пра вас казаць, Людмілачка? Расхвальвае на ўсе лады.

Вяртаюцца Іра і Алег. Алег трымае ў руках бутэльку шампанскага.

Іра (*да Алега*). Нічога ты не разумееш! Яму кажуць віна, а ён прыносіць шампанскае!

Алег. Я думаў, Ірачка...

Іра. Я ніколі не піла шампанскага.

Сіўкоў. Ты чаго накінулася на яго, Ірынка? Людачка, гэтае шампанскае табе нічога не напамінае?

Людміла Пятроўна. Што ты ўсё ўспамінаеш?

Сіўкоў. Не, усё ж успомні маладосць, успомні!

Людміла Пятроўна. Маладосць... Што ты сябе

ў дзяды запісваеш! *(Да Шацько.)* Шаснаццаць год назад, калі я яшчэ ў яго ў падсобніцах лічылася...

Сіўкоў. Ты нявестай маёй лічылася.

Людміла Пятроўна. ... Нявестай таксама. Мы парашылі разам паехаць у Кахоўку. Федзя перад самым ад'ездам прыйшоў да мяне з шампанскім.

Сіўкоў. Яна ж збіралася ў першы раз на сваім вяселлі шампанскага адведаць. *(Да Іры.)* Можа і ты так?

Іра *(загарэлася)*. Ні пра якое вяселле я не думаю!

Шацько *(да Алега)*. Тым больш, хлопча, няма чаго апраўдвацца. Выпіць за сустрэчу — шампанскае ў самы раз.

Сіўкоў. Ім за расставанне піць трэба.

Алег. Хведар Іванавіч, а калі такі варыянт... Ці нельга, каб Іра... словам, была са мною. *(Злавіўшы позірк Іры.)* Я з ёй...

Сіўкоў. Нешта ты, хлопец, загаварваешся.

Іра. Ён хоча сказаць...

Сіўкоў. Я хачу сказаць так: калі кахаеце, разлучацца няма чаго — ні табе з ёю, ні ёй з табою. Мы з Людмілай Пятроўнай у вашы гады так зрабілі.

Людміла Пятроўна. Мы і ў нашы гады так паступаем.

Шацько. Хіба ж Хведар Іванавіч збіраецца куды-небудзь ехаць?

Размахваючы партфелем, ускочыла Бубкіна.

Бубкіна *(з парога, хуценька)*. З прыездам, таварыш Сіўкоў! Бубкіна вітае вас ад калектыву жылканторы! Усім астатнім агульнае здрасце.

Сіўкоў. Добры вечар, Мая Гур'еўна. *(Паказвае на Алега і Шацько.)* Знаёмцеся.

Бубкіна *(энергічна цісне руку Шацько)*. Бубкіна. *(Ківае галавою Алегу.)* Бубкіна.

Людміла Пятроўна. Прысаджвайцеся, Мая Гур'еўна.

Бубкіна. Не, таварыш Сіўкова. Бубкіна — у некаторай ступені дакладчык...

Сіўкоў. Можа, перанясем даклад? Спачатку павячэраем.

Бубкіна. Нельга, таварыш Сіўкоў. Бубкіна спазняецца адразу ў чатыры месцы. *(Дастае з партфеля паперы.)* Прашу ўвагі. На заўтра ў жылкантору для атрымання ардэроў выклікаюцца ўсе навасельцы першай чаргі новых дамоў.

Сіўкоў. Дзякую, прыйду. А якой гадзіне?

Бубкіна. Персанальна вам не трэба. Да вас Бубкіна прыйшла сама. Як да лепшага нашага буд...

Сіўкоў. Ой, толькі без лепшых, таварыш Бубкіна.

Бубкіна *(гучней)*. А я падкрэсліваю: як да лепшага. І яшчэ, як да будучага дэпутата першага склікання пасялковага Савета.

Сіўкоў. Не ведаў.

Бубкіна. І не можа ж гэтага быць, каб вы ведалі раней за Бубкіну... Прашу ўвагі. Вам, згодна аднагалоснага рашэння камісіі, даецца двухпакаёвая кватэра. Маецца наступны выбар. *(Раскладае на стале план дома.)* Глядзіце. Другі паверх. Два сумежныя. Чатырнаццаць метраў і дваццаць адзін. Ці трэці паверх. Кубатура на паўтара метра меншая, але затое вокны — на ўсход. Ці чацвёрты паверх...

Людміла Пятроўна. Не трэба. Ні другога, ні трэцяга, ні чацвёртага...

Сіўкоў *(здзіўлена)*. Ты што?

Бубкіна. Хвіліначку, таварыш Сіўкоў! У жылбытпытаннях жонка навасельца мае рашаючы голас, як і сам навасялец. Бубкіна з вамі згодна, таварыш Сіўкова. Такі работнік, як ваш муж, мае права патрабаваць трохпакаёвую кватэру. *(Да Людмілы Пятроўны.)* Не турбуйцеся! У Бубкінай ёсць вам трохпакаёвая. Яе хацелі мантажніку Трушыну... Ён, праўда, мнагадзетны бацька, але, на жаль, не вядомы...

Людміла Пятроўна *(хоча яе перапыніць)*. Вы мяне не зразумелі!

Бубкіна. Бубкіна ўсіх разумее. І я...

Людміла Пятроўна *(крычыць)*. Нам не трэба і трохпакаёвая!

Бубкіна *(трагічна)*. Што?! Але чатырохпакаёвых у нас няма. Давядзецца чакаць другой чаргі.

Людміла Пятроўна. Нам зусім не трэба кватэра.

Бубкіна *(села ад нечаканасці)*. Людзі добрыя! Восем год Бубкіна працуе на жылбытпытаннях. Але гэта першы выпадак, каб добраахвотна адмаўляліся ад кватэры! *(Не даючы Людміле Пятроўне адказаць)*. Не, ілгу: быў выпадак, але па прычыне запланаванага разводу. *(Паглядзела на Сіўкова.)* Няўжо...

Сіўкоў. Ціпун вам на язык, таварыш Бубкіна!

Бубкіна. Памылілася? Што ж, рада, што ў вас дружная, моцная савецкая сям'я. Рада.

Людміла Пятроўна. Але наша дружная, моцная савецкая сям'я адсюль едзе.

Сіўкоў (*здзіўлена*). Люда?!

Людміла Пятроўна. Хай Мая Гур'еўна першая даведаецца...

Бубкіна. Бубкіна ўсё першая ведае.

Людміла Пятроўна. ... што ты пераводзішся на Далёкі Усход.

Іра. Не можа быць!

Людміла Пятроўна. Чаму ж — не можа, Ірынка?

Бубкіна (*сурова*). Чаму не можа, дзяўчына,— чалавек павінен ісці ўгору. І калі таварышу Сіўкову там прапанавалі значнае павышэнне...

Людміла Пятроўна. Якое павышэнне! На Амуры новая пляцоўка. Новыя механізмы. Хведар Іванавіч і ў гарах ужо будаваў, і ў стэпе. У тайзе не даводзілася. Яго пацягнула туды. Так пацягнула, што...

Сіўкоў. Людачка! Я табе ні слова не казаў!

Людміла Пятроўна. Эх, Федзя... Якая б была я жонка, каб за шаснаццаць год не навучылася разумець цябе без слоў.

Шацько (*да Сіўкова*). Ну, што ты скажаш, голуб?

Сіўкоў (*усхвалявана*). Нічога не скажу. (*Абдымае і цалуе Людмілу Пятроўну.*)

Людміла Пятроўна. А я скажу: пакрыўдзілі майго Федзю.

Шацько. Хто пакрыўдзіў?

Людміла Пятроўна. Міністр. Хіба Хведар Сіўкоў працуе горш за Шота Санадзе? Маладых хіба горш вучыць? Чаму ж міністр яму пісьма не паслаў?

Шацько. Паслаў. Людмілачка, паслаў. (*Да Сіўкова.*) Але пісьмо табе... не перадалі.

Сіўкоў. Хто не парадаў?

Шацько (*ціха*). Я не перадаў. (*Дастае канверт і аддае Сіўкову*). Вось.

Сіўкоў. Чаму?

Шацько (*пасля паўзы*). Я думаў... (*Вінавата паглядзеў на Людмілу Пятроўну.*)

Людміла Пятроўна (*з гневам*). Што я ўчаплюся Хведару за рукаў?

Шацько. У кожнага старога бывае замарока, сярдэнька Людмілачка. Здалося мне, старому дурню, што вы... трохі перамяніліся.

Іра (*зазіраючы ў пісьмо, якое чытае Сіўкоў*). Уррра! Жывём, Алежак!

Алег. Што такое, Іра?

Іра. Прачытай, што ў канцы напісана!

Людміла Пятроўна. Што, Федзя?

Сіўкоў (*чытае*). «Калі вы, Хведар Іванавіч, згодзіцеся паехаць на Амур, дык я дам указанне начальніку будаўніцтва адпусціць з вамі тых экскаватаршчыкаў, якіх вы палічыце патрэбным запрасіць».

Бубкіна (*з замілаваннем*). Умеюць жа людзі пісаць паперы.

Алег (*да Сіўкова*). Цяпер ужо Іра са мною паедзе.

Іра. Ён хоча сказаць — з вамі, згодна дазволу міністра.

Сіўкоў (*да Алега*). Пачакай, хлопец, можа я... не палічу патрэбным запрашаць Ірынку. Дык ты што, зноў нюні распусціш? Будзеш парады пытаць? Ці на разлуку згодзішся?

Алег маўчыць.

Кахаеш — не чакай загадаў міністра. Не разлучайся — і ўсё. Чуеш?

Іра. Ён чуе, Хведар Іванавіч. Ён зразумеў.

Бубкіна. Прашу ўвагі! (*Да Сіўкова.*) Не будучы бюракратам, Бубкіна пакуль не выкрэслівае вас са спісу. У вас яшчэ ёсць час перадумаць — да адзінаццаці нуль-нуль заўтрашняга дня.

Людміла Пятроўна. Не, Мая Гур'еўна, мы не перадумаем.

Бубкіна. У такім выпадку — агульнае будзьце здаровы.

Людміла Пятроўна. Пасядзіце з намі, Мая Гур'еўна.

Бубкіна. Што ж, ад бакала шампанскага Бубкіна не адмовіцца. (*Сядае.*)

Шацько. Пачакайце. А раптам яшчэ да шампанскага я вас сагітую махнуць з намі на Амур? Энергіі вам, бачу, пазычаць не трэба. Яшчэ б навучыцца вам усміхацца — і вы там развернецеся! Паедзем?

Бубкіна (*устае*). Прабачце. Бубкіна спазняецца ў чатыры месцы адразу. (*Выходзіць.*)

Шацько. Ну што ж, астаецца перайсці да цякучых спраў. Дзе ў вас, Людмілачка, бакалы? (*Хоча адкрываць бутэльку.*)

Сіўкоў. Пачакай. (*Да Алега.*) Ты як па вершаванай частцы? Складаеш верш?

Алег (*вінавата*). Не.

Іра. Калі трэба, ён складае! А што?

С і ў к о ў. Трэба да нашай песні дапісаць пра Далёкі Усход.

Ш а ц ь к о. Ну, ведаеш, Федзя, калі па геаграфіі пайсці, дык нашай песні канца-краю не будзе. Лепей пра тое дапішам, як у сапраўдных будаўнікоў сэрцы не старэюць. Таму так і рады ім усюды, дзе б яны ні пакінулі свой след на зямлі. *(Пачынае спяваць).*

Нас встречают улыбкой весёлой,
Мы повсюду найдём земляков.
Среди удалых молодых новосёлов,
Среди мастеров-стариков.

Усе падхопліваюць прыпеў:

Во славу народа-героя,
Во имя великих идей
Мы строим, мы строим, мы строим
Для блага советских людей.


З а с л о н а.


Пераклад з рускай мовы Б. САЧАНКІ.

ПЕСНЯ СТРОИТЕЛЕЙ

В ТЕМПЕ МАРША







ду - ге от Па - ми ра до се - вер - ных

рек вез - де и по - всю - ду ра -

- бо - чий-стро - и - тель по - чёт - ный у нас че - ло -

ПРИПЕВ:

- век. Во сла - ву на - ро - да ге -

cant.

- ро - я, во и - мя ве - ли - ких и -

marc

ff

- дей. Мы стро - им, мы стро - им, мы

ff

marc.

строяем для блага советских людей! Мы строяем, мы строяем, мы строяем для блага советских лю-

1.3. дей! 2. И пре- 2.4. дей!

mf *f*

3. И в мо-

ff *mf*

В НОЯБРЕ НА ДВОРЕ

(шуточная песня)

Музыка Н. Кутузова

Слова П. Косоножкина

ОЖИВЛЁННО, С ЮМОРОМ

Одна

В но_я_ бре на дво_ре хо_лод_но нем_нож_ ко, Кто_то ве_че_ром ко мне по_сту_чал в о_кош_ко По_сту_чал и ска_зал: „Вый_ди на ми_нут_ ку." Ес_ли па_ рень зо_ вёт, зна_чит не на шут_ ку Уж я так и сяк

Замедляя

В темпе

mp

от- го- ва- ри- ва-лась. Не хо-те-ла вы-хо-дить.

p М М

mf

а са-ма на- пра- ви-лась,

Хор

Уж я так

f

mf М 7

f Б М

а сяк от- го- ва- ри- ва- лась.

М Б М 7 Б 7

Для 1 и 2 куплетов

mp

Не хо- те- ла вы- хо- дить, а са-ма на- пра-ви-лась.

f

p М М *f* М 7

Для конца

Двое В темпе

Ес- ли лю- бишь, го- во- рю, не мо-розь, а сва-тай

Медленнее В темпе

М М М 7

1. В ноябре на дворе холодно немножко.
Кто-то вечером ко мне постучал в окошко.
Постучал и сказал: «Выйди на минутку».
Если парень зовёт, значит не на шутку.
Уж я так и сяк отговаривалась.
Не хотела выходить, а сама направилась. } 2 раза


2. Выхожу — он стоит. А мороз ужасный.
«Как сегодня,— говорит,— ноченька прекрасна!»
И завёл речь свою тихо и уныло,
А я бедная стою, прямо вся застыла.
Уж я так и сяк отговаривалась.
Стоять вроде холодно, а самой понравилось. } 2 раза

3. Постояла я с ним, кажется, немного.
Только чувствую — совсем отмерзают ноги.
Он и сам задрожал, трусится бедняжка.
И, наверно б, убежал, если б не милашка.
Уж не греет никак ни любовь, ни вата.
«Если любишь,—говорю, — не морозь,
а сватай». } 2 раза

НЕПОНЯТЛИВЫЙ ТАКОЙ

Музыка Г. Пономаренко — Слова В. Бокова

Игриво







-янс - та за ре - кой. Толь - ко

есть в нем яв - ный ми - нус — не - по -

-нят - яв - ный та кой. По - ни - ма -

2 девушка

Вместе

-ешь? По - ни - ма - ю. У не -

-го по - нять-я нет, у не - го по - нять я

нет, что та - ко - е двад - цать лет.

что та - ко - е двад - цать лет, что та - ко - е двадцать

лет.

Для повторения

2. На мос-

Для окончания

- как.

1. Ой, подружки, я влюбилась
В гармониста за рекой.
Только есть в нём явный
минус —
Непонятливый такой.
Понимаешь? — Понимаю.
У него понятья нет, (2 раза)
Что такое двадцать лет. (3 раза)

2. На мосту идёт гулянье,
Я танцую и пою.
На меня он ноль вниманья
И на выходку мою.
Понимаешь? — Понимаю.
Хоть сирень и расцвела, (2 раза)
Но неважные дела. (3 раза)

3. Подошла, заговорила
О погоде, о весне, —
Он уселся на перила
И в ответ ни слова мне.
Понимаешь? — Понимаю.
Под мостом река журчит. (2 раза)
Почему же он молчит? (3 раза)

4. Я горю, с лица меняюсь,
А в душе моей прибой.
Только слышу:
«Извиняюсь, —
Говорит, — пора домой».
Понимаешь? — Понимаю.
Это было над рекой. (2 раза)
Потеряла я покой. (3 раза)

5. Ой, подружки, я влюбилась,
И любви своей боюсь.
Неужели в милом минус
Не заменится на плюс?
Понимаешь? — Понимаю.
Ох, какой попал чудак! (2 раза)
Не поймёт меня никак. (3 раза)

ЛАСКОВАЯ ПЕСНЯ

Музыка В. Мурадели

Слова С. Острового

УМЕРЕННО, НАПЕВНО

1. Ночь плывёт над зем - лё - ю,

пле - щет звёзд - ным ог - нём.

Ся - дем ря - дом с те - бо - ю,

ти - хо пе - сню спо - ём.

ПРИПЕВ:

Сколь - ко слов у люб - ви?

Ты од - но на - зо - ви,

чтоб всег - да,

до кон-ца би-лись ря-дом серд-ца.

Сколь-ко слов у люб-ви? Ты од-но на-зо-

-ви, чтоб всег-да, до кон-ца

Для повторения | Для окончания

би-лись ря-дом серд-ца. -ца.

1. Ночь плывёт над землёю,
Плещет звёздным огнём.
Сядем рядом с тобою,
Тихо песню споём.

Припев:

Сколько слов у любви?
Ты одно назови,
Чтоб всегда, до конца
Бились рядом сердца. } 2 раза

2. Если любишь и веришь,
Все дороги ясны.
Океаны измеришь,
Долетишь до Луны.

Припев.

3. Я люблю тебя очень.
И в мечтах о судьбе
Этой звездною ночью
Я пою о тебе.

Припев:

Сколько слов у любви?
Ты одно назови,
Чтоб всегда, до конца
Бились рядом сердца. 2 раза